ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар Установы
адукацыі “Нясвіжская
дзяржаўная беларуская
гімназія”
Т.В.Шумоўская
10.03.2010

**Палажэнне**
праекта Установы адукацыі “Нясвіжская дзяржаўная беларуская гімназія”
“Мы – нашчадкі Перамогі”

**Глава I. Агульнае палажэнне.**

На падставе Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка ад 25 лютага 2008 года № 110 “Аб падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 65-й гадавіны вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне” і ў адпаведнасці з планам выхаваўчай і ідэалагічнай работы на 2009-2010 вучэбны год ва Установе адукацыі “Нясвіжская дзяржаўная беларуская гімназія” арганізоўваецца праект “Мы – нашчадкі Перамогі”.

**Мэта праекта:**

– удасканаленне сістэмы патрыятычнага выхавання вучняў, фарміраванне ў іх пачуцця любові да Радзімы на прыкладзе баявых подзвігаў ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, якія замацаваны за ўстановай адукацыі;

- прапаганда мужнасці і гераізму беларускага народа, які адстаяў свабоду і незалежнасць Айчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны;

- далучэнне навучэнцаў да навуковай, творчай, пошукавай работы па рэалізацыі творчых конкурсаў па грамадзянска-патрыятычным выхаванні.

**Задача праекта:**

- стварэнне ўмоў для развіцця творчых, пошукавых здольнасцей зрабіць добрае, карыснае, запамінальнае;
- фарміраванне пачуцця глыбокай павагі да ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны;
- максімальнае раскрыццё эмацыянальна-сцэнічнага патэнцыялу вучняў;
- імкненне паказаць дзецям цану Перамогі.

Удзельнікі праекта – навучэнцы 1 – 11 класаў Установы адукацыі “Нясвіжская дзяржаўная беларуская гімназія”.

Узнагароджванне пераможцаў усіх конкурсаў праекта будзе праходзіць падчас урачыстага канцэрта 8 мая 2010 года. “Мы – нашчадкі Перамогі”.

Палажэнне, інфармацыя аб правядзенні конкурсаў Праекта размяшчаецца на інфармацыйным стэндзе "На гімназічнай хвалі", стэндах пярвічных арганізацый БРСМ і БРПА, на афіцыйным сайце ўстановы адукацыі.

**Глава II. Парадак і ўмовы правядзення Праекта**.

1. Час правядзення праекта 15 сакавіка па 8 мая 2010 года.

Праект уключае Вахту Памяці, выставы творчых работ, экскурсіі ў Залу баявой славы, сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, урачысты канцэрт "Мы – нашчадкі Перамогі" і конкурсы, прысвечаныя 65-й гадавіне вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў:

- конкурс юнармейскіх атрадаў (дадатак 1.);
- конкурс электронных прэзентацый "Перамога дзядоў і прадзедаў – наша Перамога" (Дадатак 2.);
- конкурс плакатаў і малюнкаў "З чаго пачынаецца Радзіма" (Дадатак 3.);
- конкурс паэтаў (Дадатак 4.);
- інтэлектуальная гульня "Перагортваючы старонкі гісторыі" (Дадатак 5.);
- конкурс дэкаратыўна-прыкладной творчасці "Падарунак ветэрану" (Дадатак 6.);
- конкурс буклетаў "У імя жыцця" (Дадатак 7.).

2. Для рэалізацыі Праекта ствараецца арганізацыйны камітэт у складзе:

Шумоўская Т.В. – дырэктар установы адукацыі;

Лясніцкая Т.А., намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце – старшыня;

Хілько В.С., Цярпіцкая Т.А. – члены арганазацыйнага камітэта;

Чамярэўская Дар'я, старшыня пярвічнай арганізацыі БРСМ;

Жэрка Ірына – старшыня піянерскай дружыны ім. А.Гайдара.

3. Конкурсы Праекта праводзяцца ў адпаведнасці з дадаткамі 1-7. Па выніках конкурсаў Праекта лепшыя работы ўдзельнічаюць у раённых конкурсах (электронных прэзентацый, малюнкаў і плакатаў), у выставе творчых работ, урачыстым канцэрце 8 мая 2010 года.

4. Пераможцы кожнага конкурсу Праекта ўзнагароджваюцца дыпломамі ўстановы адукацыі і прызамі.

Дадатак 1
да палажэння праекта
“Мы – нашчадкі Перамогі”

**Конкурс – агляд юнармейскіх атрадаў**

1. Удзельнікамі конкурсу-агляду з’яўляюцца вучні 2-4 класаў
2. Кожны атрад мае назву, дэвіз, эмблему, песню, парадную форму
3. Конкурс праходзіць у 3 этапы:
   1 этап : удзельнікі выконваюць простыя страявыя каманды камандзіра атрада і прадстаўляюць свой атрад
   2 этап : Конкурс патрыятычнай песні. Пры выкананні ўлічваюцца патрыятычнасць, сэнсавы змест і мастацкае выкананне
   3 этпа : “Баявы лісток”
   Ацэньваецца Змест, эстэтычнасць афармлення.

4 . Конкурс адбудзецца 16 красавіка 2010 года

Дадатак 2
да палажэння праекта
“Мы – нашчадкі Перамогі”

**Конкурс электронных прэзентацый**
**“Перамога дзядоў і прадзедаў – наша Перамога”**

1. Гімназічны конкурс электронных прэзентацый “Перамога дзядоў і прадзедаў – наша Перамога” праводзіцца ў рамках Праекта, укараняючы інавацыйныя формы патрыятычнага выхавання моладзі на аснове прымянення камп’ютэрных і інтэрнет-тэхналогій.

2. Удзельнікамі конкурсу з’яўляюцца вучні 9 – 11 класаў.

3. Тэматыка электронных прэзентацый наступная:

- “Дні воінскай славы Беларусі”;
- “Раўненне на герояў” (пра подзвігі воінаў арміі ў нашы дні);
- “Дарогай герояў” (аповед пра ветэранаў, дзейнасць музеяў, залы баявой славы);
- “Дзяцінства, апаленае вайной” (аповед пра юных герояў Вялікай Айчыннай вайны);
- “Зброя Перамогі” (баявая тэхніка і зброя часоў Вялікай Айчыннай вайны );
- “Помнікі і мемарыялы воінам, якія загінулі за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы” (Нясвіж і Нясвіжскі раён);
- “Гарады-героі”;
- “Усё для фронта, усё для перамогі”.

4. Работы на конкурс прадстаўляюцца ў аргкамітэт да **7 красавіка 2010 года.**

5. Па выбранай тэме прадастаўляецца электронная прэзентацыя (віртуальная экскурсія, мультымедыйны ўрок мужнасці) з прымяненнем любых відаў камп’ютэрных тэхналогій у памеры ад 25 – 50 слайдаў.

Работа павінна мець адукацыйную каштоўнасць, выхаваўчае значэнне, высокі ўзровень тэхнічнага выканання (анімацыя, музычнае і гукавое суправаджэнне).

Конкурсная работа прадастаўляецца на кампакт-дысках CD-RW ці CD-R.

6. Заахвочваюцца работы з выкарыстаннем архіўнага, сямейнага матэрыялу, фотаздымкаў, асабістых адносін да падзей і фактаў. Абавязковым з’яўляецца спасылка на выкарыстаныя крыніцы (у тым ліку адрас Інтэрнет).

Дадатак 3
да палажэння праекта
“Мы – нашчадкі Перамогі”

**Конкурс плакатаў і малюнкаў**
**“З чаго пачынаецца Радзіма”**

1. Удзельнікамі конкурсу малюнкаў і плакатаў з’яўляюцца вучні 1 – 8 класаў (ад класа 2 работы).

2. Тэматыка работ наступная:
- пейзаж showing розны Нясвіжчыны (месца баявой славы, гісторыка-культурныя комплексы);
- партрэт героя-пераможца.

3. Тэхніка выканання: жывапіс (гуаш, акварэль), графіка.
Фармат работы А1 – А4. Работа афармляецца ў паспарту не менш за 25 мм.

4. Работы прадастаўляюцца ў аргкамітэт да 8 красавіка 2010 года.

Дадатак 4
да палажэння праекта
“Мы – нашчадкі Перамогі”

**Конкурс юных паэтаў**

1. Удзельнікамі конкурсу юных паэтаў можна стаць вучань гімназіі, які піша ўласныя вершы.

2. Тэматыка конкурсных работ наступная:
- Радзіма і яе краявіды;
- Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне беларускага народа.

3. Заяўкі на ўдзел у конкурсе падаць у аргкамітэт да 19 красавіка 2010 года па наступнай форме:

| клас | Прозвішча, імя паэта | назва верша |
| --- | --- | --- |

4. Конкурс юных паэтаў адбудзецца 24 красавіка 2010 года.

5. Крытэрыі ацэнкі:
- сцэнічная культура;
- сцэнічнае маўленне;
- выканаўчае майстэрства.

Дадатак 5
да палажэння праекта
“Мы – нашчадкі Перамогі”

**Аб правядзенні інтэлектуальнай гульні**
**“Перагортваючы старонкі гісторыі”**

1. Удзельнікамі інтэлектуальнай гульні могуць быць каманды 8-11 класаў, якія падалі заяўку на ўдзел да 12 красавіка ў аргкамітэт.

2. Склад каманды з паралелі – 8 чалавек

2. Ігра мае тры туры па 15 пытанняў на тэму “Вялікая Айчынная вайна ў гісторыі чалавецтва”

3. Інтэлектуальная гульня адбудзецца 24 красавіка 2010 года.

Дадатак 6
да палажэння праекта
“Мы – нашчадкі Перамогі”

**Конкурс дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва**
**“Падарунак ветэрану”**

1. Удзельнікамі конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Падарунак ветэрану” з’яўляюцца вучні 5 – 7 класаў.

2. Творчыя работы прымаюцца да 30 красавіка 2010 года (па 3 работы ад класа).

Работы могуць быць выкананы ў любой тэхніцы, выкарыстоўваючы любы від дэкаратыўна-прыкладной творчасці.

3. Да работы дадаецца інфармацыя:

| клас | Прозвішча, імя аўтара | назва работы |
| --- | --- | --- |

4. Крытэрыі ацэнкі:

- майстэрства выканання творчай работы;
- адпаведнасць тэме конкурсу;
- практычнае прымяненне.

Дадатак 7
да палажэння праекта
“Мы – нашчадкі Перамогі”

**Конкурс буклетаў**
**“У імя жыцця”**

1. Удзельнікамі конкурсу буклетаў “У імя жыцця” з’яўляюцца вучні 9, 10 класаў.

2. Тэматыка буклетаў прысвечана падзеям Вялікай Айчыннай вайны на Нясвіжчыне.

3. Крытэрыі ацэнкі:
- арыгінальнасць падачы матэрыялу;
- актуальнасць, практычнае прымяненне інфармацыі;
- мастацкае афармленне.

Тытульны ліст павінен змяшчаць інфармацыю аб аўтары(-ах) творчай работы.

4. Конкурс буклетаў праводзіцца да 5 мая 2010 года.

Этапы рэалізацыі праекта

| № п/п | Мерапрыемства | Тэрмін | Адказны |
|---|---|---|---|
| 1. | Правядзенне інфармацыйных гадзін, урокаў мужнасці “Беларусь. Гісторыя перамогі”. | сакавік - май | класныя кіраўнікі 1 – 11 класаў |
| 2. | Вахта Памяці:<br>- уборка магіл Ю.Мастоўскага, Невядомага салдата ў в.Мікулічы, стэлы на тэрыторыі ўстановы адукацыі | красавік | Хаванская І.У., Шчурская Н.В. |
| | - віншаванне ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны са святам Перамогі; | да 9 мая | класныя кіраўнікі 5 – 11 класаў |
| | - удзел у дэманстрацыі, прысв. 65-й гадавіне Перамогі савецкага народа ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. | 9 мая | Настаўнікі, вучні 9 – 11 класаў |
| 3. | Арганізацыя экскурсій у гісторыка-краязнаўчы музей, музей-запаведнік “Нясвіж”, залу баявой славы гімназіі. | сакавік - май | класныя кіраўнікі 1 – 11 класаў |
| 4. | Наведванне кінатэатра “Салют” з праглядам кінафільмаў, прысвечаеных Дню Перамогі | сакавік - май | класныя кіраўнікі 1 – 11 класаў |
| 5. | Агляд юнармейскіх атрадаў | красавік | класныя кіраўнікі 2 – 4 класаў, Каткова Л.Я. |
| 6. | Конкурс электронных прэзентацый “Перамога дзядоў і прадзедаў – наша Перамога” | да 7 красавіка | класныя кіраўнікі 9 – 11 класаў |
| 7. | Конкурс малюнкаў і плакатаў “З чаго пачынаецца Радзіма” | да 8 красавіка | класныя кіраўнікі 1 – 8 класаў |
| 8. | Конкурс юных паэтаў | 24.04.2010 | класныя кіраўнікі 1 – |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | 11 класаў, настаўнікі – філолагі |
| 9. | Правядзенне інтэлектуальнай гульні “Перагортваючы старонкі гісторыі” | 24.04.2010 | класныя кіраўнікі 8-11 класаў, Лосік А.М. |
| 10. | Конкурс дэкаратыўна -прыкладной творчасці “Падарунак ветэрану” | 30.04.2010 | класныя кіраўнікі 5 – 7 класаў, Шыцько В.І. |
| 11. | Конкурс буклетаў “У імя жыцця” | 05.05.2010 | класныя кіраўнікі 9,10 класаў |
| 12. | Арганізацыя выставы творчых работ “Памяць. Перамога”. | да 7 мая | Лясніцкая Т.А. |
| 13. | Святочны канцэрт “Мы – нашчадкі Перамогі”. Віншаванне ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджванне пераможцаў праекта | 8 мая | Лясніцкая Т.А., Варанко В.Л., Юдзіна Н.У. |

Члены журы

| | |
|---|---|
| Конкурс – агляд юнармейскіх атрадаў | Шумоўская Т.В.<br>Субач Н.Ю.<br>Лясніцкая Т.А. |
| Конкурс электронных прэзентацый<br>“Перамога дзядоў і прадзедаў –<br>наша Перамога” | Хілько В<br>Скачко Ж.І.<br>Борыс А.У.<br>Лясніцкая Т.А.<br>Лосік А.М. |
| Конкурс плакатаў і малюнкаў<br>“З чаго пачынаецца Радзіма” | Каткова Л.Я.<br>Лясніцкая Т.А.<br>Курочка І.Б.<br>Шумоўская Т.В. |
| Конкурс юных паэтаў | Субач Н.Ю.<br>Швайко Н.М.<br>Варанко В.Л.<br>Лясніцкая Т.А. |
| Інтэлектуальная гульня<br>“Перагортваючы старонкі гісторыі” | Хілько В.С.<br>Катчанка У.М.<br>Шумоўская Т.В.<br>Лосік А.М. |
| Конкурс дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва<br>“Падарунак ветэрану” | Лясніцкая Т.А.<br>Каткова Л.Я.<br>Курачка І.Б.<br>Шыцько В.І. |
| Конкурс буклетаў<br>“У імя жыцця” | Хілько В.С.<br>Лосік А.М.<br>Субач Н.Ю.<br>Лясніцкая Т.А. |